# АГЕНЬЧЫК БЕЛАРУСКАГА СЛОВА

***На пачатку снежня ўжо ў восьмы раз на факультэце гуманітарыстыкі і моўных камунікацый прайшоў Фестываль беларускага слова. Сёлета ён быў прысвечаны 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. На працягу тыдня праводзіліся цікавыя мерапрыемствы, пра некаторыя з іх хачу распавесці больш падрабязна.***

## Спектакль «Два.Я.К.ія»

Ён прысвячаўся Янку Купалу і Якубу Коласу, праз прызму іх вершаў былі паказаны некаторыя моманты з гісторыі беларускага народа. Рэжысёрам-пастаноўшчыкам выступіла студэнтка 3 курса ФГіМК Аляксандра Даніленка, ролі таксама выконвалі фгімкаўцы.

«Да прэм'еры мы рыхталіся на працягу трох месяцаў. Ідэя ўзнікла, калі наш дэкан папрасіў паставіць спектакль на беларускай мове. Прачытаўшы вершы класікаў, я адразу ўявіла, якая пастаноўка можа атрымацца. У выніку ўсё прайшло так, як было запланавана. Спектакль усім спадабаўся. Як мне падаецца, у нас з акцёрамі атрымалася данесці думку пра тое, што кожны павінен быць патрыётам і ўсведамляць сябе носьбітам культурнай спадчыны», – адзначыла Аляксандра.

## Ліцэісты – госці Літаратурнага музея

Цікавае мерапрыемства чакала ліцэістаў у Народным літаратурным музеі. Хлопцы і дзяўчаты разам з дацэнтамі К.С. Півавар і Г.А. Гладковай пазнаёміліся з экспазіцыяй музея; даведаліся, якія мясціны Віцебшчыны звязаны з лёсам і творчасцю класікаў; паразважалі пра тое, якую спадчыну яны пакінулі; прачыталі некаторыя вершы.

Ліцэістам было цікава і пазнавальна, яны ўзбагацілі ўласныя веды і будуць выкарыстоўваць гэтую інфармацыю падчас вучобы.

## «Яшчур» і «Каза ў арэхах»

У апошні дзень фестывалю ў студэнтаў была магчымасць прыняць удзел у беларускай народнай моладзевай гульні «Яшчур». Цікава, што гэтая гульня была распаўсюджана на Пастаўшчыне ў мінулым стагоддзі, а сёння ўваходзіць у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

Таксама ў гэты дзень студэнты 31 групы прадставілі музычную беларускую казку «Каза ў арэхах».

«З казкай мы пазнаёміліся на пары па гісторыі беларускай літаратуры. Падзяліліся па ролях і пачалі «гуляць». А падчас падрыхтоўкі да фестывалю крыху яе інтэрпрэтыравалі пад сучаснасць, падабралі музыку сённяшніх артыстаў і смешныя касцюмы. Кожны герой казкі выходзіў пад сваю вясёлую мелодыю, а ў фінале прагучала песня «Сланечнік» групы «Дразды», і ўсе госці пачалі вадзіць карагод», – успомніла Дзіяна Бруева, студэнтка 31 группы.



## Падагульненне

Тыдзень быў насычаным, каляровым, неверагодным і праляцеў вельмі хутка.

«Правядзенне фестывалю такога кшталту лічу вельмі важнай культурнай падзеяй, бо любы жадаючы мог не толькі, метафарычна кажучы, далучыцца да сваіх нацыянальных вытокаў, але і стаць носьбітам і папулярызатарам іх у нашым сучасным свеце. Гледзячы на шчаслівыя вочы фгімкаўцаў, пераканаўся, што агеньчык беларускага мастацкага слова па-ранейшаму саграває душы новага пакалення», – падагульніў Віталь Падстаўленка, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**Анастасія КАСЦЮКЕВІЧ, студэнтка 3 курса ФГіМК.**
**Фота Дзіяны ГАЛАВАЧ.**